patrickstory.ie

# *Хто насамрэч Бог?*

*Ár nAthair, atá ar neamh…*

*Ці ёсць Бог? Якога Бога вы хацелі б, каб ён быў?*

*Калі жыццё лёгкае, мы часта не бачым неабходнасці ў Богу ці жадаем бога-«чароўнага джына» - таго, хто дарue нам усё, што мы жадаем. Але насамрэч такі бог нам бескарысны - гэта быў бы бог пад нашым кантролем, маленькі бог. Калі жыццё становіцца цяжкім, нам патрэбная надзея — нам патрэбен Бог больш за нашы праблемы і той, каго мы можам спазнаць.*

*Магчыма, на вашае бачанне Бога паўплывалі высокія саборы – для вас гэта слаўны, але далёкі Бог; або палымяныя пропаведзі — для вас Ён вечна гнеўны Бог, заўсёды гатовы пакараць; або крывадушнасць тых, хто сцвярджае, што ідзе за Богам — на жаль, гэта звычайная з'ява.*

*Але што, калі сапраўдны Бог іншы? Вось некалькі ключавых якасцяў, пра якія Патрык пісаў з уласнага досведу:*

*Добры. «Гэта доўгая гісторыя… як я расказваю пра тое, як добры Бог часта вызваляў мяне ад рабства…» Добры Бог?*

*Хіба нам не прыходзіла ў галаву думка, што сярод усіх цяжкасцяў, якія выпадаюць нам і якіх мы не разумеем, - калі ёсць Бог, то ён на самой справе не такі і добры? Але нам на дапамогу прыходзяць словы таго, хто нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія мяняюць жыццё, знайшоў гэтую асноватворную ісціну: Бог добры.*

*Магутны. Калі Бог добры, можа, ён не магутны? Зноў пачуйце Патрыка: «Я быў нібы камень, кінуты ў глыбокі бруд; але прыйшоў Усемагутны і падняў мяне… павярнуў кірунак майго жыцця да дабра». Магчыма, вы адчуваеце, што вашае жыццё ўжо не выправіць? Але ёсць Бог, дастаткова магутны, каб таксама «павярнуць кірунак вашага жыцця да дабра». Патрык і незлічоная колькасць іншых хрысціян пераканаліся, што гэта ісціна, і распяцце і ўваскрасенне таксама гэта пацвярджаюць. Бог магутны.*

*Даступны пазнанню. Бог не далёка і не высока над вамі; вы можаце спазнаць яго. Патрык піша: «Вось чаму я не магу маўчаць… калі наша жыццё мяняецца, і мы прыходзім да пазнання Бога...» Не проста ведаць пра Яго, але на самой справе спазнаць Яго — гэта больш, чым верыць, быць у стане сказаць разам з Патрыкам «Гасподзь Бог мой».*

*Бог добры, магутны і пазнавальны, і калі гэтыя тры ўласцівасці спалучаюцца, тады мы можам знайсці і спазнаць сапраўдную надзею і дапамогу.*

*Патрык спазнаў сапраўднага і жывога Бога, і вы таксама можаце спазнаць Яго. Вось дзе гэта пачынаецца:*

*«Мяне клічуць Патрык.*

*Я грэшнік, просты вясковы чалавек, апошні сярод усіх веруючых.*

*Я прызнаў свае недахопы. Таму я ўсім сэрцам звярнуўся да Госпада Бога майго»*